# БЕЛАРУСКАЯ ПЕСЕННА-ІНТЫМНАЯ ЛІРЫКА XVII-XVIIІСТСТ.: ПАМІЖ ФАЛЬКЛОРАМ І ЛІТАРАТУРАЙ

***Т. Л. Нетбаева***
Навуковы кіраўнік – д.філал.н., прафесар ***С. В. Кавалеў***
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Мэта даследвання – прааналізаваць паэтыку беларускай песенна-інтымнай лірыкі XVII-XVIII стст. і высветліць, наколькі яна падобная да паэтыкі народных песень пра каханне; а таксама вылучыць асаблівасці інтымных вершаў, іншымі словамі, прасачыць, што з’явілася ў інтымнай лірыцы новага (у параўнанні з фальклорам) у плане вобразаў, матываў, лексікі, што прыйшло ў яе з літаратуры. Пры гэтым аналіз абапіраецца на супастаўленне паэтыкі інтымнай лірыкі з асноўнымі прынцыпамі стварэння фальклорных і літаратурных тэкстаў.

Песенна-інтымная лірыка (гэты тэрмін увёў ва ўжытак А.І. Мальдзіс), у розных навуковых традыцыях называецца па-рознаму. У польскай літаратуры гэта “мяшчанская паэзія” (паводле К. Бадэцкага) або “папулярная любоўная лірыка” (паводле Я. Катарскай). У рускім варыянце – гэта “книжные песни” (паводле І.К. Гарэлавай) або “увеселительные канты” (па назве рукапіснага зборніка XVIII ст.).

Сувязь з фальклорам прасочваецца на некалькіх узроўнях (вобразна-выяўленчых сродкаў народнай лірыкі, інтанацыйна-сінтаксічнай сістэмы народнапесеннай мовы і інш.). Можна адзначыць такія фальклорныя запазычанні ў інтымнай лірыцы, як наяўнасць эпітэтаў (у тым ліку і інверсаваных), прыметнікаў і назоўнікаў у ласкальна-памяншальнай форме, ужыванне вобразна-псіхалагічных і фармальных паралелізмаў, фальклорнай сімволікі, увасабленняў, выкарыстанне беларускіх традыцыйных імёнаў. На ўзроўні інтанацыйна-сінтаксічнай сістэмы народнапесеннай мовы трэба адзначыць ужыванне паўтораў, зваротак, інверсій і іншых сродкаў мастацкай выразнасці. Акрамя таго, у творах песенна-інтымнай лірыкі адлюстраваны народны погляд на каханне, а таксама выяўляюцца шматлікія фальклорныя матывы.

У той жа час трэба адзначыць і такія адметнасці тэкстаў інтымнай лірыкі, якія паказваюць на “нефальклорны”, кніжны характар запазычанняў у вершах: рэдкае выкарыстанне сталых эпітэтаў, адсутнасць зваротаў да сонца, зорак, месяца – славянскіх паганскіх боства, рэдкае ўжыванне тыповых для фальклору таўталагічных спалучэнняў словаў, наяўнасць вершаў яўна эратычнага зместу, узбагачэнне лексікі вершаў. Акрамя таго, значна розніцца танальнасць песенна-інтымнай і народнай лірык: у параўнанні з фальклорнымі творамі інтымная лірыка выглядае больш “прыземленай”, менш паэтычнай. Літаратурныя традыцыі сярэднявечча, Рэнесансу і барока аказалі свой уплыў на беларускую песенна-інтымную лірыку.

Беларуская песенна-інтымная лірыка XVII-XVIII стст. – з’ява сінтэтычныга характару. З аднаго боку, яна з’яўляецца носьбітам фальклорных традыцый, у ёй сустракаюцца вобразна-выяўленчыя сродкі народнай лірыкі, інтанацыйна-сінтаксічная сістэма народнапесеннай мовы, выкарыстоўваюцца традыцыйныя фальклорныя вобразы і матывы. А з другога боку, яна з’яўляецца носьбітам літаратурных традыцый. Хутчэй за ўсё, уплыў літаратуршчыны адбываўся па той прычыне, што аўтары (хоць і ананімныя) вершаў беларускай песенна-інтымнай лірыкі былі шкалярамі, а значыцца, людзьмі не пазбаўленымі нейкай адукацыі. Відаць, наяўнасць ведаў, іншымі словамі, адукаванасць, начытанасць складальнікаў песень і паспрыяла літаратурным запазычанням у творах інтымнай лірыкі.

Песенна-інтымная лірыка адыграла вялікую ролю ў гісторыі беларускай літаратуры. Вершы інтымнай лірыкі пісаліся як ў форме лірычнага маналога, так і ў форме разгорнутага дыялога; удасканальваліся строфіка і рытміка, сілабічнае вершаскладанне змянялася сілабатанічным. А гэта значна паспрыяла развіццю беларускага вершаскладання.

На сённяшні дзень вядомыя каля 150 тэкстаў беларускай песенна-інтымнай лірыкі (з іх апублікавана ў розных выданнях каля 42). Таму у далейшым было б мэтазгодным разгледзець неапублікаваныя творы беларускай песенна-інтымнай лірыкі, а таксама аналагічныя тэксты на украінскай, польскай і рускай мовах з тым, каб параўнаць іх паэтыку і вобразнасць з пункту гледжання прыналежнасці іх да пэўнай культурнай традыцыі, а таксама з пункту гледжання выяўлення ў іх тых ці іншых этанакультурных архетыпаў.